ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№18 (1132)
ЧАЦВЕР,
22 лістапада
2007 г.

*Выходзіць два разы ў месяц*
*Цана дагаворная*

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета заснавана ў верасні 1969 года*

**Навіны, падзеі**

## ПОГЛЯД ПРАЗ ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ

Канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, адбылася ў Гомельскім гарадскім Савеце ветэранаў.

Цікавасць яе ўдзельнікаў – ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і працы, моладзі – выклікалі даклады і паведамленні, з якімі выступілі вучоныя вну горада, у тым ліку і кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі В.У. Матусевіч. Віталь Уладзіміравіч падрыхтаваў на канферэнцыю даклад "Вялікі Кастрычнік – погляд праз 90 гадоў".

Старшыня гарадскога Савета ветэранаў В.А. Кукушкін даслаў на адрас кіраўніцтва нашага універсітэта ліст, у якім выказаў шчырыя словы падзякі В.У. Матусевічу за грунтоўнае і аб'ектыўнае асвятленне гістарычнай падзеі – рэвалюцыі 1917 года.

## ЖЫЦЦЁ, АДДАДЗЕНАЕ ПОДЗВІГУ

Адзначаючы 64-ю гадавіну вызвалення г. Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, мы ўшаноўваем памяць загінуўшых салдат, якія ахвяравалі жыццём за наша мірнае сёння, аддаём даніну глыбокай павагі ветэранам, якія засталіся адзінымі сведкамі жудасных ваенных часоў.

Пакланяючыся перад іх гераічным подзвігам, студэнты нашага універсітэта – члены валанцёрскага таварыства "Сябар дзяцей" (кіраўнік – дацэнт Т.П. Гараніна) наведалі Дом-інтэрнат для ветэранаў вайны, працы і інвалідаў "Васільеўка" **(на здымку)**.



Яскравая канцэртная праграма, падрыхтаваная моладдзю, прывезеныя імі падарункі сталі сапраўдным сюрпрызам для пажылых людзей, якім хутка перадаліся і цёплыя ўсмешкі юнакоў і дзяўчат, іх зарад бадзёрасці, добрага настрою і кіпучай энергіі. У выніку гэтай душэўнай сустрэчы ветэраны пераканаліся ў тым, што час не змарнаваў іх самаадданы подзвіг, пра які памятаюць, за які дзякуюць.

**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

## ЛЕПШЫ Ў ПРАЦЫ

Падведзены вынікі рэспубліканскага і абласнога конкурсаў ГА "БРСМ" на лепшы студэнцкі атрад і лепшага наймальніка ў летнім працоўным семестры 2007 года. Не застаўся ў баку ад гэтай важнай падзеі і наш універсітэт, які кожнае лета накіроўвае найбольш актыўных студэнтаў на працу ў валанцёрскія, сервісныя і сельскагаспадарчыя атрады.

У намінацыі "Лепшы баец атрада, які працаваў за межамі Рэспублікі Беларусь", першае месца заняў пяцікурснік гістарычнага факультэта ГДУ Дзмітрый Парадзін. Паспяховая дзейнасць у дзіцячым санаторыі "Ака" г. Анапы дазволіла нашаму студэнту стаць лепшым не толькі на абласным, але і на рэспубліканскім узроўні.

## У МЕЖАХ ПРАВАВОГА ПОЛЯ

У першай дэкадзе лістапада Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы пры ўдзеле спецыялістаў ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, Міністэрства адукацыі правёў для работнікаў кадравых служб і кіраўнікоў структурных падраздзяленняў устаноў адукацыі краіны семінар-практыкум на тэму "Асаблівасці прававога рэгулявання працоўных і звязаных з імі адносін ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь".

Удзельнікі семінара разгледзелі і абмеркавалі пытанні аб прававым рэгуляванні аплаты працы работнікаў адукацыі, стыпендыяльным забеспячэнні студэнцкай моладзі, якія вынікаюць з прыняцця ў апошні час новых нарматыўных актаў, павелічэння памераў базавай велічыні і стаўкі першага разраду.

У ўзнятым коле пытанняў былі таксама змены і дапаўненні, унесеныя ў Працоўны Кодэкс Рэспублікі Беларусь, асаблівасці рэгулявання працы педагагічных (навуковых) работнікаў, асоб, якія працуюць па сумяшчальніцтву. Удзельнікі семінара азнаёміліся з новай нарматыўнай базай па вышэйшай школе. Яна прыведзена ў адпаведнасць з прынятым Законам Рэспублікі Беларусь аб вышэйшай адукацыі.

У рабоце семінара прынялі ўдзел начальнік планава-фінансавага аддзела С.Я. Пашук і начальнік аддзела кадраў нашага універсітэта Т.І. Осіпава.

## КЛОПАТ ПРА ПРАБЛЕМЫ МОЛАДЗІ

У пачатку лістапада на базе Беларускага агратэхнічнага універсітэта (г. Мінск) адбылася сустрэча міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь А.М. Радзькова са студэнцкім актывам вышэйшых навучальных устаноў краіны.

На яе былі запрошаны студэнты – лідэры прафсаюзных і пярвічных арганізацый ГА «БРСМ», органаў студэнцкага самакіравання, а таксама моладзь, якая мае выдатныя паказчыкі ў вучэбнай, навуковай, спартыўнай дзейнасці. Наш універсітэт на мерапрыемстве прадстаўлялі пяцікурсніца факультэта замежных моў Наталля Баброва і чацвёртакурснік гістфака Сяргей Ерамееў.

У ходзе свайго выступлення А.М. Радзькоў звярнуў увагу на эфектыўнасць сістэмы дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі моладзі, неабходнасць яе другаснай занятасці, развіццё студэнцкай навукі і сістэмы па фарміраванню здаровага ладу жыцця, дзейнасць пярвічных арганізацый ГА "БРСМ" і інш.

У канцы мерапрыемства міністр адказаў на шматлікія пытанні, якія сёння найбольш хвалююць студэнтаў. У прыватнасці, падчас дыялогу з моладдзю былі закрануты праблемы дзяржаўнага размеркавання маладых спецыялістаў, іх сацыяльнай падтрымкі, працаўладкавання выпускнікоў, якія вучыліся на платнай аснове, забяспечанасці студэнтаў месцамі ў інтэрнатах і г.д.

## ВЕДЫ СЛАБЫЯ? ПАДМАЦУЙЦЕ!

Першыя месяцы вучобы ва універсітэце першакурснікаў, іх бягучая паспяховасць сведчаць аб тым, што многія з іх маюць істотныя прабелы па базавых дысцыплінах – матэматыцы, фізіцы, хіміі і інш. А гэта адмоўна можа адбіцца на выніках зімовай сесіі – іх першага "баявога хрышчэння". Каб яно не стала і апошнім, не давялося развітацца са студэнцкім жыццём, неабходна зараз прыкласці максімум намаганняў і веды свае папоўніць.

У гэтым першакурснікам дапамогуць дадатковыя заняткі па вывучэнні асобных дысцыплін на паглыбленым і павышаным узроўні, якія пачалі праводзіцца ў другой дэкадзе лістапада на фізічным, біялагічным і гістарычным факультэтах. Яны працягнуцца да канца бягучага семестра, будуць весціся і на працягу наступнага, да 10 мая.

Справа гэта не абавязковая, а добраахвотная, але многія студэнты, аб'ектыўна ацаніўшы свае веды, прынялі правільнае рашэнне, якое дасць ім рэальны шанс не "заваліць" першыя экзамены.

Заняткі праводзяцца ў групах па 12-15 студэнтаў па зацверджаных праграмах з разліку 4-5 гадзін на тыдзень на платнай аснове. Кошт іх за месяц складае 20 тыс. руб. Гэта дапоўніла пералік відаў платных паслуг, якія аказваюцца выкладчыкамі універсітэта ва ўмовах пазабюджэтнай дзейнасці.

**(Наш кар.)**

Студент и наука

## ПЕРВЫЙ ШАГ – УВЕРЕННЫЙ

**В Национальной академии наук Беларуси состоялся форум «Первый шаг в науку – 2007», участницей которого довелось стать и мне.**



В его программе были пленарное и секционные заседания, желающим было предложено поучаствовать в интеллектуальном турнире для школьников и студентов «Планета «Креатив», круглом столе «Практика и перспективы международного сотрудничества молодых ученых», пресс-конференции «Новые имена, новые открытия».

Хочу отметить доброжелательное отношение к нам компетентного жюри, в состав которого входили известные ученые нашей республики академик В.И. Парфенов, доктора биологических наук Н.П. Максимова и А.Н. Евтушенков и др.

Участники форума представляли свои проекты и исследования в различных областях наук. Мой доклад был заявлен на секции «Биологические науки». В данной работе я проанализировала результаты двулетнего изучения сезонного ритма развития и анатомической структуры лекарственного растения в разных стадиях развития в условиях посева. За нее я получила Диплом, который мне вручил на форуме председатель Президиума НАН Б М. Мясникович.

Организаторы и представители НАН Б сделали все, чтобы наши секционные заседания прошли интересно и познавательно. Они охотно делились с молодежью своим опытом и знаниями, давали советы на будущее.

Участие в подобном форуме – это прекрасная возможность реализовать свои познания, научные стремления, узнать много нового, приобрести опыт публичных выступлений.

**Екатерина ШУКОВА,**
**студентка 4 курса биофака.**
**Фото В. ЧИСТИКА.**

## САМЫЙ ЛУЧШИЙ ПРАЗДНИК!

**Международный День студента – самый веселый праздник. Его с нетерпением ждут все «мученики науки», к нему усердно готовятся. У многих юношей и девушек есть свои традиции празднования этого замечательного дня. Своими секретами с нами поделились представители разных факультетов. Так, студенты факультета иностранных языков предпочитают отмечать эту дату шумно и весело, поэтому собираются группами и дружно идут в кафе или пиццерию. С ними солидарны и биологи, которые в этот день как правило рассылают прикольные sms-ки друзьям, посещают праздничные концерты и дискотеки.**

Самой главной традицией Дня студента в общежитии №1 ГГУ является проведение праздничного вечера. Этот год не стал исключением. Своими выступлениями порадовали присутствующих студенты, проживающие в общежитии. Они исполнили песни популярных артистов эстрады. От души смеялись гости праздника над «семейной ссорой» и другими конкурсами, в которых приняли участие зрители.

Хорошее настроение участников мероприятия поддержали своей игрой на гитарах студенты физфака из группы «Рифы», а также очаровательные исполнительницы зажигательных танцев с факультета физической культуры. Завершился концерт выступлением любимцев публики – студенческого театра эстрадных миниатюр.

В целом все студенты отмечают этот праздник с таким размахом, что это запоминается на весь год.

**Татьяна РОМАНЧУК,**
**Татьяна МИРОНЧУК,**
**студентки гр.БФЖ-33 филфака.**

На конкурс

# МОЙ УНІВЕРСІТЭТ – МАЁ ЖЫЦЦЁ



Выбіраючы сваю будучую alma mater, я асабліва не задумвалася. Сваю ўвагу звяртала толькі на тое, што падабалася, што было па сілах, на тое, да чаго хілілася душа. І не памылілася. Хачу нават сказаць, што вучыцца мне падабаецца (бываюць на свеце і такія дзівакі!).

Ды і універсітэт свой я люблю. Люблю яго за доўгія чэргі ў буфет і гардэроб, за званок, які чакаеш, як sms-ку ад каханага, за СУРСы і рэфераты, якія звычайна пішаш у апошнюю ноч.

Але ўсё гэта здаецца не істотным, калі разумееш, што ўжо праз паўтары гады атрымаеш дыплом і ўсе студэнцкія будні застануцца толькі ва ўспамінах. Зараз ўсё ацэньваеш па-іншаму. Менш крыўдуеш на аднагрупнікаў, якім ужо разоў дзесяць тлумачыла адно і тое. Цярпліва ставішся да патрабаванняў выкладчыкаў, бо добра разумееш: калі б не іх заданні, то мы, студэнты, увогуле нічога б не вучылі.

З хваляваннем і неспакоем чакаеш канца семестра, зімовую сесію. І не таму, што страшна здаваць экзамены (колькі іх ужо здадзена!), а таму, што яны ўсяго толькі чарговыя прыступкі да самага адказнага іспыту – педагагічнай практыкі. Падчас яе можна будзе яшчэ раз праверыць правільнасць свайго выбару.

За тры з паловай гады навучання універсітэт стаў для мяне другім домам. Тут, у родным вучэбным корпусе №1, мне знаёмы кожны куток. З дзвярэй гэтых аўдыторый я выходжу акрыленая новым поспехам або засмучаная няўдачай з абавязковым жаданнем нешта выправіць і змяніць. Універсітэт многае памяняў у маім жыцці, і не толькі знешне. Я зараз лягчэй і прасцей успрымаю нешта новае і незвычайнае.

Мая alma mater падарыла мне цудоўную магчымасць сустрэцца з выдатнымі паэтамі Л. Дранько-Майсюком, Н. Шкляравай, супрацоўнікамі "ЛіМа" і "Дзеяслова". Разам са сваімі аднагрупнікамі я наведала рэдакцыю абласной газеты "Гомельская праўда", Гомельскае радыё і тэлебачанне, прыняла ўдзел у запісе ток-шоу "Разбор полетов". На ўсё жыццё мне запомняцца выдатныя мясціны Кіева, Кіева-Пячэрская Лаўра, Полацкая Сафія, непаўторная Тураўшчына і чароўнае возера Свіцязь. А думкі аб тым, што ў Нясвіжскім парку, па якім мы гулялі падчас вандровак, некалі бавілі Радзівілы, Сапегі, Агінскія, прыносяць адчуванне, што мы дакрануліся да гісторыі.

Але самае галоўнае, што менавіта тут я знайшла сапраўдных сябровак, якім я магу даверыць свае самыя патаемныя думкі. З імі я магу весела бавіць час, адзначаючы святы, і плакаць над няшчаслівым каханнем і няспраўджанымі марамі. Гэта тыя людзі, за дапамогу якіх я заўсёды змагу разлічваць і дзеля якіх я зраблю ўсё магчымае і немагчымае.

Мой універсітэт. Студэнцкае жыццё. Сябры. Вучоба. Каханне... Зусім хутка ўсё гэта застанецца ў мінулым. А пакуль у мяне ёсць яшчэ паўтары гады непаўторнага студэнцкага жыцця, якое я ўмею цаніць і любіць.

**Таццяна БАНДАРЧУК,**
**студэнтка гр. БФЖ-42 філфака.**
**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

# ПРИГЛАШЕНИЕ К ДИАЛОГУ И СОТРУДНИЧЕСТВУ

**Как уже сообщалось в предыдущем номере нашей газеты, в университете состоялась встреча студентов с начальником отдела по делам молодежи Гомельского городского исполнительного комитета Владимиром Приваловым.**

**– Цель таких встреч со студенчеством, – отметил он в начале своего выступления, – узнать мнение молодежи о том, что ей наиболее интересно, чем живет она сегодня, что может предложить местной власти для того, чтобы та строила свою работу с учетом мнения и пожеланий юношей и девушек, а следовательно, жизнь в Гомеле становилась для них более интересной, насыщенной полезными делами, давала возможность чувствовать себя социально защищенным, проявить свои способности, таланты, быть гармоничными людьми.**

В. Привалов призвал юношей и девушек к диалогу, который состоялся во время встречи, и к дальнейшему сотрудничеству с отделом молодежи горисполкома, осуществлять который можно с помощью электронного сайта в сети «Интернет» (**www.brsmgomel.org**) и специального раздела «Молодежь» на официальном сайте Гомельского горисполкома (**www.gorod.gomel.by**).

Вниманию студентов была предложена интересная информация о реализации государственной молодежной политики в г. Гомеле, основополагающую роль в которой играет программа «Молодежь г. Гомеля» на 2006 – 2010 годы. Принятие данной программы обусловлено тем, что в настоящее время в г. Гомеле проживает свыше 146 тыс. человек в возрасте от 14 до 31 года (более 30% от общей численности населения города).

В. Привалов ознакомил участников встречи с такими основными ее направлениями, как гражданско-патриотическое воспитание, организация вторичной занятости, совершенствование системы социальной защиты молодежи и молодой семьи, поддержка талантливой и творческой молодежи, пропаганда здорового образа жизни, международное сотрудничество, профилактика негативных явлений в молодежной среде, экологическое воспитание юношей и девушек и др.

На сегодняшний день в г. Гомеле действует около 30 организационных структур молодежных общественных объединений, среди которых наиболее активным является «Белорусский Республиканский союз молодежи», насчитывающий в своих рядах около 21000 человек. Талантливая, творческая молодежь имеет возможность продемонстрировать свои способности в таких городских мероприятиях, как «Мы – лучшие в БРСМ», в конкурсе научно-технического творчества, интеллектуальных играх «Что? Где? Когда?», которые проводит Гомельский клуб «Белая Рысь», фестивалях молодежи и студентов «Студенческая жара», «На пути к Олимпу», «Дружба славян», в КВН-овском движении. В традиционных акциях «Мы – граждане Беларуси», «Государство и молодежь: в партнерстве залог успеха», «Спасибо, ветераны, за Победу!», которые воспитывают у молодых людей чувство патриотизма, ежегодно принимают участие более 3000 юношей и девушек.

Хорошей возможностью для вступления в трудовую жизнь стало возрождение лучших традиций студенчества, одна из которых – стройотрядовское движение. Количество его участников постоянно растет. Лучшие отряды, их бойцы и командиры награждаются на ежегодных фестивалях «Трудовой семестр».

Одно из новых направлений программы «Молодежь г. Гомеля» – экологическое воспитание. В рамках деятельности волонтеров проведен фестиваль «Экофорум –2006», акция ОО «БРСМ» «Союз молодежи – за чистый Гомель», организуются субботники по благоустройству города, зон отдыха, закладке новых парков и скверов.

Очень актуальной для молодых людей остается проблема получения жилья. Отдел по делам молодежи горисполкома оказывает им содействие в информировании о нормативно-правовой базе по вопросам строительства квартир, получения льготных кредитов.

Злободневными в молодежной среде являются табакокурение, наркомания, растет процент ВИЧ-инфицированных, поэтому профилактике этих явлений должно уделяться особенно серьезное внимание. Молодые люди участвуют в проведении акций «Гомельщина – за здоровый образ жизни», «Остановить СПИД. Выполнить обещания!» и др.

Наша задача, подчеркнул в конце встречи В. Привалов, состоит в том, что мы обязаны сохранить и приумножить наш потенциал, развить все достижения и победы, к которым так долго шли. И при этом главную роль здесь должна сыграть молодежь.

Волонтерское движение

# ПСИХОЛОГИЧЕСКАЯ ПОМОЩЬ БОЛЬНЫМ ДЕТЯМ

В г. Бресте состоялась V Международная ярмарка социальных проектов, на которой было представлено 75 творческих разработок из разных городов Беларуси. Характер проектов был разнообразен, но основная задача каждого из них заключалась в оказании социальной поддержки детям и молодежи, детям-инвалидам и молодым инвалидам, пожилым людям, женщинам. Большое значение придавалось также профилактике правонарушений, наркомании, алкоголизма, бродяжничества и других негативных явлений в обществе.

Кафедра социальной и педагогической психологии факультета психологии и довузовской подготовки ГГУ представила на ярмарке студенческий волонтерский проект «Психологическое сопровождение детей, страдающих хроническими заболеваниями и находящихся на лечении в стационаре», который реализуется в рамках студенческой научно-исследовательской лаборатории. Студенты-волонтеры осуществляют его в хирургическом и гастроэнтерологическом отделениях Гомельской детской областной больницы, гематологическом отделении Республиканского центра радиационной медицины и экологии человека.

Проект в прошлом учебном году стал лауреатом IV Международной ярмарки и на этот раз также получил очень высокую оценку оргкомитета. Мы надеемся, что он откроет новые перспективы развития волонтерского движения в оказании помощи детям, находящимся на лечении в стационаре больниц во многих городах Беларуси.

**М. КОРШУН,**
**студентка 4 курса факультета психологии и довузовской подготовки, участница ярмарки.**

# И НАШЕГО ТЕПЛА ЧАСТИЧКА

Выражение благодарности приемным родителям, опекунским семьям за возвращенное детство – такой была основная цель VI областного слета «Будь моим родителем», который недавно прошел в Гомельском областном Дворце творчества детей и молодежи «Юность».

Здесь мальчики и девочки показывали свои работы и находили новых друзей. А их приемным родителям в это время была предоставлена возможность решения юридических, психолого-педагогических и медицинских вопросов с помощью приглашенных сюда специалистов управления юстиции облисполкома, социально-педагогического центра, консультантов по охране прав детства, неврологов, педиатров Гомельской областной больницы.

Пока папы и мамы обсуждали «взрослые» вопросы, ребята под присмотром волонтеров первичной организации ОО «БРСМ» нашего университета приняли активное участие в задорной игровой программе с многочисленными щедрыми призами.

Настоящим праздником и кульминацией всего мероприятия стали праздничный концерт с участием приемных детей, а также сладкий стол, организованный на денежные добровольные пожертвования, поступившие на счет «Белорусского детского фонда», и средства, собранные членами ПО ОО «БРСМ» ГГУ.

**Галина БОЛТИК,**
**студентка факультета психологии и довузовской подготовки,**
**член пресс-службы ОО «БРСМ» ГГУ.**

# МОДЕЛИРОВАНИЕ ООН: НАШИ СТУДЕНТЫ В МИРОВОЙ ПОЛИТИКЕ

В г. Минске проводилось моделирование заседания Экономического и Социального Совета Организации Объединенных Наций. Эта ролевая игра, во время которой имитируется деятельность организации, ставила своей целью ознакомление студентов с работой системы органов ООН. Участники выступают в роли представителей государств – членов организации и обсуждают текущие вопросы повестки дня, ищут пути решения глобальных проблем. Модель ООН – своеобразная школа жизни: делегаты поставлены в условия мгновенного принятия решений, лоббирования интересов своей страны, кулуарной работы, ведения переговоров и достижения компромисса.

Впервые авторы этих строк, студенты 5-го курса специальности «Мировая экономика» нашего университета, приняли участие в данном мероприятии, где они представляли 3 страны – Беларусь, США и Демократическую Республику Конго.

Большинство участников игры составляли студенты БГУ, так как этот вуз сотрудничает с ООН, но также были приглашены студенты из Гомеля (ГГУ), Могилева, Мозыря и даже Канады. На повестке дня стояли 4 мировые проблемы: глобальное потепление; региональное сотрудничество и устойчивое развитие; миграция и беженцы; гуманитарная помощь. По ним рассматривались по два проекта резолюций. Каждый участник с позиции своей страны мог вносить в них поправки с аргументированным обоснованием, вести формальные и неформальные дебаты, голосовать за принятие проекта резолюций.



Надо сказать, такое распределение стран было для нас поначалу шокирующим, так как мы заявляли другие страны. Пришлось взять всю свою волю в кулак, поднапрячься и погрузиться в «ночную паутину мировой сети» для изучения необходимого материала.

Сложилось впечатление, что мы находились на настоящем заседании ECOSOC UN, так как церемонию открывал Илья Тодорович – Представитель УВКБ ООН в Республике Беларусь. Кроме того, заседание, голосование по резолюциям, дебаты проводились по правилам ECOSOC UN. А чтобы поддержать интерес к «неформальному общению», организаторы устроили занимательную вечеринку с различными конкурсами, играми и дискотекой, где «делегаты» вернулись в свое привычное состояние студенчества. После такого общения достижение консенсуса между противостоящими странами стало очевидным и неизбежным. А наши старания и бессонные ночи в Интернете были отмечены Дипломами (**на снимке**).

На наш взгляд, для наработки навыков делового общения, практики экономической и дипломатической лексики английского языка имеет смысл участвовать в таких играх, начиная с 1 курса. Кроме того, игра является стимулом к изучению важных мировых проблем и отношения стран к ним. Мы получили уникальный шанс познакомиться на собственном опыте с дипломатической работой ООН. А так как моделирование ООН проводится на международном уровне, то предоставляется возможность попробовать свои силы в разных странах мира.

Остается только сказать: «Будьте уверены в себе и в своих силах!».

**М. КЛЮЧИНСКАЯ,**
**О. РЕПЬЕВСКАЯ,**
**Н. САВИЦКАЯ,**
**студентки 5 курса экономфака.**

# ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА

Ірына БАЖОК,
студэнтка групы БФА-34 філфака

## Monotony

У штодзённай стабільнасці,
У векавой манатоннасці –
Нараджэнне не пільнасці,
Нараджэнне будзённасці.
І ў стане замкнёнасці,
І ў пошуках вартасці
Ёсць часцінка свядомасці,
Ёсць надзея духоўнасці.
Але ж белага няма
У радасці.
Як і чорнага няма
У жудасці.

## Калі хочаш, калі можаш, то...

Ты мне радасць зямлі падары,
Прынясі ў шырокіх далонях сваіх.
Як крапчэй ты мяне абдымі.
І мне радасць зямлі падары.

Ты мне казку жыцця падары,
Над прасторамі ветрам спявай,
Ты таемнасці свету збяры.
І мне казку жыцця падары.

Лепш прысутнасць сваю падары,
Сэрца стук, і дыханне, і погляд
вачэй.
Ды нічога ты мне не кажы.
Памаўчы. І прысутнасць сваю
падары.

Інтэрв'ю

## Паэт павінен быць шчырым...

**Школа-студыя маладога літаратара дзейнічае ў Гомелі пры спецыялізаванай Славянскай бібліятэцы з сакавіка бягучага года. Кіраўнік гэтай школы – Ніна Шклярава, вядомая паэтэса і перакладчыца, выпускніца ГДУ імя Ф. Скарыны. Мы сустрэліся з ёй, каб пацікавіцца пра дзейнасць маладых літаратараў Гомельшчыны.**

**– Ніна Нічыпараўна, калі не сакрэт, хто ініцыятар стварэння школы-студыі?**

– Яшчэ на з'ездзе пісьменнікаў Беларусі старшыня Гомельскага аддзялення пісьменнікаў Уладзімір Гаўрыловіч прапанаваў мне стварыць школу маладога літаратара. Верагодна, таму, што ў мяне ёсць неабходны настаўніцкі вопыт, ды й вершы пішу на беларускай і рускай мовах, займаюся перакладамі. Так, убачыла свет мая новая кніжка перакладаў "Аберуч". Яшчэ я асмелілася цалкам перакласці "Слова пра паход Ігаравы" са старажытнай рускай мовы на беларускую. Прапанову шчыра падтрымалі дырэктар спецыялізаванай Славянскай бібліятэкі Лілія Фёдараўна Буланава і старшыня абласнога Савета дэпутатаў Валерый Сцяпанавіч Сяліцкі.

**Вершы маладых літаратараў заслугоўваюць увагі?**

– Заслугоўваюць. Ёсць таленавітыя творцы. Калі іх накіраваць туды, куды трэба – атрымаюцца сапраўдныя паэты. Галоўнае, каб напісаўшы ў рыфму чатыры радочкі, яны не думалі, што дасягнулі чагосьці значнага ў жыцці. Як казала Ніна Мацяш: "Паэта ствараць з сябе прыходзіцца ўсё жыццё..."

**– Можа, кагосьці сёння Вы пахваліце?**

– Вось, да прыкладу, той жа Валодзя Чараухін. Дапытлівы, цікаўны. Паправіш часам ягоны радок, а ён імкнецца ўсё зрабіць па-свойму. Вершы Валодзі вылучаюцца непаўторнасцю, філасофскім роздумам. Шкада, што юнак страціў зрок... Цяпер рыхтуецца да чарговай аперацыі на вачах, якая каштуе адну тысячу даляраў. Веру, што добрыя людзі дапамогуць хлопцу вярнуць зрок.

**– Сёлета адбыўся першы абласны літаратурны конкурс імя Кірылы Тураўскага. Ці ўзялі ўдзел у ім Вашы выхаванцы?**

– А як жа! Пераможцамі сярод дэбютантаў сталі студэнт філфака ГДУ імя Ф.Скарыны Алесь Бараноўскі і малады інжынер Дзмітрый Нілаў.

**– Ніна Нічыпараўна, школа-студыя дзейнічае, як Вы сказалі, на грамадскіх пачатках. Вам не шкада свайго вольнага часу?**

– Некаму ж трэба гэтую справу рабіць! Каб нас чыталі, ведалі, каб у беларускай літаратуры была будучыня, трэба вырасціць сабе добрую змену. Гэта, вобразна мовячы, як на зарослым радовішчы! Калі бачыш на дрэве маладыя атожылкі, іх трэба даглядаць, каб яны набіраліся сілы. І яшчэ адна важная дэталь: паэту трэба быць шчырым з чытачом, а не красамоўным. Калі ягоныя выказванні былі пачутыя, зразумелыя – можна лічыць творцу шчаслівым!

**Ганна АТРОШЧАНКА.**

Антон КРАХМАЛЬНІК,
выпускнік філфака

***

Як быццам слуга ў пакаёвай
прасторы,
Сардэчны мой выпад, салодкі
адказ...
Чаму ў душы тваёй вечнае
мора, —
Жаданнем пякучых абраз?

Што могуць тады мімалётныя
словы
Змяніць у часовым малюнку
быцця?
Не трэба не так зразумелую
мову
Нам ставіць на верхні
прыступак жыцця.

Бо слова ў палёце, пачуцце –
у сэрцы.
Яны – як два берагі бурнай
ракі.
Пачуцці – у сэрцы, а слова
сарвецца.
Чаму? Лёс жыццёвы,
напэўна, такі...

Калі ты не бачыш ва мне
ідэалу,
Не трэба схіляць галаву
да акна...
Спытаў... У адказ толькі ты
прамаўчала...
Прабач, не мая ўжо гэта віна...

Мария МЕЛЬНИКОВА,
студентка гр. А-22 факультета
иностранных языков

## Любимой маме

В один октябрьский славный день
Случилось маленькое чудо
(Так разрывает неба тень
Вдруг радуга! Она откуда?):

Явилась девочка на свет
Подобно ангелу красива.
Ее прекрасней в мире нет,
Хоть годы мчатся торопливо.

Она всегда была такой:
Красивой самой, умной, славной.
Она забыла про покой –
Она моею стала мамой.

Как фея добрая моя,
Мне дарит сердце, не жалея.
Она всегда поймет меня,
Убережет и обогреет.

У нас в семье всегда тепло
И даже в зимний холод – лето.
От глаз твоих всем нам светло.
Спасибо, мамочка, за это!

Виктория ШУВАЛОВА,
студентка гр. РБ-33
филфака

## КЛЕНОВЫЙ ЛИСТ

Я стою, смотрю в окошко,
Вижу листьев хоровод.
Призадумалась немножко,
Загадала наперед...

Лист кленовый,
желто-красный,
Как красив его наряд!
Он по-своему прекрасный
Ветру северному рад.

Лист кленовый,
лист осенний
Мне напомнил о былом.
В детство снова
я вернулась,
К маме милой в
теплый дом.

Алесь БАРАНОЎСКІ,
студэнт гр. БФ-21 філфака

## МАМА

З прыветным паглядам сустрэне
цябе на парозе:
"Прыехаў дадому, ты шчасце прынес
нам, сынок!
Як справы твае, прытаміўся, напэўна,
у дарозе?
Чакала цябе, ты да нас усяго на дзянёк..."

Прыбрана ў пакоях, пастаўлены раніцай
кветкі –
Руплівыя рукі не ведаюць стомы штодня.
Шчаслівая маці, калі яе шчаслівы дзеці,
Яны – яе сонца, прамень сярод
хмарнага дня.

Блакітныя вочы – люстэрка бяздоннага
неба,
У бездані гэтай агеньчык любові гарыць.
І дзе б не вышуквалі дзеці "жыццёвага
хлеба",
Заўсёды ім ёсць дзе свой шлях ля цяпла
прыпыніць.

***

Халоднай цішшу вечар наплывае
Дрыжачым бляскам вогненных камет.
Марудна вока ў бездані шукае,
Дзе я сваёю зоркай кінуў след.

А сэрца прагне зноў зімою лета.
Ці будзе а ці не – усё ж трэба жыць.
У Сусвеце, нібы новая планета,
На лёсе мне напісана кружыць.

Што лёс рыхтуе мне – чакаць я не баюся,
Хоць і пакутаваць даводзіцца часком.
Я на калені прыпаду і памалюся
І ціха ў куце пасяджу пад абразком.

Калі мне здарыцца стаяць на раздарожжы,
Каб я да мэты сваёй праведна ішоў,
Святая вера мне ў гэтым дапаможа,
Якую б у свеце я сцяжынку не знайшоў.

Дабром сардэчным, бы жывой вадой, нап'юся,
Усё благое сыйдзе ў зямлю пяском.
Я на калені прыпаду і памалюся
І ціха ў куце пасяджу пад абразком.

***

*Памерлай бабулі прысвячаецца*

Нешта цяжка, бы хмары ляглі мне на плечы,
Усюды пуста, і свет у вакне не гарыць.
Хоць і кажуць, што час, быццам, некага лечыць,
Але ж рана на сэрцы не ціхне – баліць.

Зараслі ўжо сцяжынкі, што віліся побач,
Ні намёку на тое, што недзе былі.
Тыя ж яблыкі, толькі не тая ўжо слодыч,
Адзічэлі зусім, ды й ляжаць на зямлі.

Не ўздымуць нас болей ля хаты арэлі,
Не пазнаць тое дрэва, дзе гушкаліся мы.
Адышлі ў нябыт, успамінам згарэлі...
Вось і скончылась лета. Чакаем зімы.

## Паэтычны дэбют

**Натхненне прыходзіць да нас у той час, калі яго зусім не чакаеш. Вось гэтак жа атрымалася і ў мяне. Калі наша група атрымала заданне па беларускай мове, у якім трэба было расказаць пра сваю сям'ю пры дапамозе "сваяцкіх тэрмінаў", я расхвалявалася. Прычына была сур'ёзная – мне хацелася напісаць нешта цікавае, не падобнае да іншых паведамленняў... І муза прыйшла мне на дапамогу!**

Ганна КОВАЛЬ,
студэнтка 1 курса юрыдычнага факультэта

## ХРЭСЬБІНЫ

Сёння ў нашай хаце свята!
З'ехалася гасцей багата.
А чаму? Што за прычына?
Сёння хрэсьбіны Галіны!

Вось да нас прыйшлі *кумы*,
*Баба* з кашай, *сваякі*...
Падарункаў поўна хата,
Разумею – гэта свята!

Свята пачалося ўранні:
Падарункі, хваляванні...
Хата ходарам ідзе –
Назбіралася ж людзей!!!

Кожны справу сваю мае:
*Маці* між сталоў лятае,
Я – малую забаўляю,
*Бацька* ж мой гасцей страчае ...

Першым завітаў *дзядуля*,
Зразумела, з ім *бабуля*,
З крыкам: – А, мая *нявестка*!
На стале няма ўжо месца!
Хоць хвілінку адпачні,
Са *свякрухай* пасядзі!

Нават *свёкар* не стрымаўся,
Звонка, гучна рассмяяўся:
– Колькі ж ты нагатавала!
Можа ты каго наймала?

Вось прыйшлі бацькі матулі
І звярнуліся да татулі:
– Як, *зяцёк* наш, пажываеш?
Што стаіш? Гасцей страчаеш?

– Мая *цешча* дарагая!
Дапамогу я чакаю.
Вы *дачцэ* скажыце, *цесцю*!
Мы не зможам столькі з'есці!

Смех рассыпаўся па хаце.
– Як жывеце, *сват* і *сваццця*?
– Ой, *сватачкі* дарагія!
Як жывём мы? Чуць жывыя!

А далей пайшлі размовы:
Хто якой хваробай хворы,
Пра знаёмых ім людзей,
Зразумела ж, пра дзяцей...

Тут пачуўся стук у дзверы.
– Праходзьце, *ятроўка*, *дзевер*, –
*Маці* ветліва сказала –
Ой, *залоўка*, не пазнала!

– Як, мяне не пазнаеш?
Ну, *брацiха*, ты даеш!
– Значыць будзеш ты багатай! –
Засмяяліс *швагер* з татам.

І хвіліны не прайшло,
Адчыніліс дзверы зноў...
– Ну, праходзьце, нашы госці!
Што стаіце на парозе?

Ой, *швагерка* дарагая,
Ты праходзь, цябе чакаем! –
*Тата* ветліва сказаў,
А затым яшчэ спытаў:

– Як *пляменнікі* мае?
Як вучоба? Нулі е?
– Дзядзька рацыю наш мае,
Без нулёў жа не бывае!!! –

Два *стрыечныя браты*
Адказалі...і тады
Хата смехам залілася.
Зноў размова пачалася.

Абмяркоўваюцца справы,
Хтось каштуе мамы стравы,
За хвіліну час ідзе,
Ад вяселля ўсё гудзе ...

Надышоў ўжо час світання,
На хвіліну смех спыніўся,
Усе задаліся пытаннем:
"Дык чаго ж мы сабраліся?"

## МОЛАДЗІ ЁСЦЬ У КАГО ПАВУЧЫЦЦА

2 лістапада адбыліся "Літаратурныя дажынкі", удзел у якіх прынялі не толькі вядомыя ў Беларусі гомельскія пісьменнікі і паэты (В.Ткачоў, Н.Шклярава), але і маладыя, дэбютанты. Свята атрымалася цікавае, шматпланавае. Узгадалі і Я.Купалу з Я.Коласам, не абмінулі ўвагай іх творчасць, бо менавіта яны заклалі той падмурак беларускай літаратуры, на якім грунтуецца сучасная паэзія і проза.

Старэйшае пакаленне пісьменнікаў на асабістыя выступленні шмат часу не адводзіла. Іх мэтай было паслухаць нас, маладых, "кволыя дрэўцы", па словах Н. Шкляравай.

Менавіта прадстаўнікі школы маладога літаратара, якая дзейнічае пры спецыялізаванай Славянскай бібліятэцы, атрымалі унікальную магчымасць выступіць на "Літаратурных дажынках". На мерапрыемстве таксама адбылася прэзентацыя новага альманаха "Натхненне ... Вдохновение", куды ўвайшлі творы пісьменнікаў Гомельшчыны. Не выпадкова кніга мае дзве назвы, бо яе аўтары пішуць альбо на рускай, альбо на беларускай мове, а некаторыя – на абедзьвюх. Прыемна, што ў гэтым зборніку змешчаны і мае вершы.

**Алесь БАРАНОЎСКІ.**

Татьяна ЖУРАВЛЕВА,
выпускница
геолого-географического
факультета

***

Дождливый день,
дождливый вечер
Напоминают мне о том,
Как жизни миг не долговечен,
Но будет солнце за дождем.

И будут взлеты и паденья,
И будет ветер перемен,
Но знаю, что
Душа моя – мое спасенье,
Она – маяк в судьбе моей.

Алексей КОЗАЧЕНКО,
студент 3 курса биофака

***

Желтым покрывалом
Расстелилась осень.
Серыми серпами
Дождь просторы
косит.
И снопами тучи
До седьмого пота
На полях небесных
Расставляет кто-то.
Ветер их срывает –
Наигравшись вволю,
Словно обессилев,
Тащит через поле.
А под вечер солнцу –
Сонно и неспешно –
Осень улыбнется
Золотой усмешкой.

Катерина КАРПЕЧКОВА,
студентка гр. БИ-51 биофака

## Бумажная осень

Бумажного цвета,
Бумажные листья
Забыли про лето.
Бумажные сказки,
Мечты и рассветы
И сердце бумажной
Любовью согрето.

***

Опадает осень в орешнике,
Красные, желтые листья.
Лето закрылось в скворечнике
И отвечает на письма.

